Д. У. ДУБІНІН

# ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАЛІТЫЧНАЙ ВУЧОБАЙ РАБОЧАГА КЛАСА: ЗГУБЫ І ЗНАХОДКІ (1976—1985)

Перабудова абудзіла грамадска-палітычную актыўнасць рабочага класа, усіх працоўных, нарадзіла мноства спосабаў яе рэалізацыі. Адначасова грамадства сутыкнулася і з негатыўнымі з'явамі, як дэмагогія, дэкларатыўнасць, падмен рэалістычных ацэнак эмацыянальным успелскам, няўменнем перавесці энергію слоў у энергію дзеянняў. Безумоўна, што ўсё гэта звязана з недахопамі ў ідэйна-палітычным выхаванні ў папярэднія гады, неадпаведнасцю паміж патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да ідэалагічнай работы ва ўмовах перабудовы і ўзроўнем яе стану. Усё гэта ставіць на пярэдні план задачу асэнсаваць работу, якая вялася ў гэтым кірунку партыйнымі арганізацыямі, паказаць не толькі станоўчы бок, што ўжо зроблена больш чым дастаткова, але і пралікі, вызначыць шляхі іх пераадольвання.

Важнай часткай ідэалагічнай работы з'яўляецца палітычная адукацыя. Яна павінна ва ўзаемадзеянні з іншымі формамі прапаганды фарміраваць у рабочага класа марксісцка-ленінскі светапогляд, класавы падыход да ацэнкі з'яў і падзей жыцця. У разглядаемы перыяд партыя вяла пошук дзейсных форм і метадаў палітычнай адукацыі, якія быў выкліканы павышэннем агульнаадукацыйнага і палітычнага ўзроўню слухачоў. У першую чаргу гэта датычылася структуры вучобы. Дзеючая да 1981 года сістэма партыйнай адукацыі склалася ў асноўным у сярэдзіне 60-х гадоў і ўключала тры звяны: пачатковае, сярэдняе і вышэйшае. Рабочыя, якія мелі недастатковую агульнаадукацыйную і палітычную падрыхтоўку, займаліся ў пачатковым звяне і вывучалі асновы палітычных ведаў, біяграфію У. І. Леніна, важнейшыя партыйныя дакументы.

Галоўнай жа формай вучобы сярэдняга звяна з'яўляліся школы асноў марксізму-ленінізму. Рабочыя, якія мелі больш высокі ўзровень падрыхтоўкі, вывучалі тут гісторыю КПСС, састаўныя часткі марксісцка-ленінскай тэорыі. Павышэнню ідэйнага ўзроўню партыйнай вучобы садзейнічалі новыя вучэбныя курсы, уведзеныя па рэкамендацыі ЦК КПСС у 1976—1978 гадах: «Актуальныя пытанні палітыкі КПСС» — для слухачоў пачатковага звяна, «Палітыка КПСС — марксізм-ленінізм у дзеянні» — для сярэдняга.

Наступным крокам якаснага паляпшэння сістэмы палітычнай адукацыі з'явілася прынятая ў маі 1981 года пастанова «Аб далейшым удасканальванні партыйнай вучобы ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС»[1]. Кіруючыся рашэннямі XXVI з'езда КПСС, вышэй названай пастановай, партыйныя арганізацыі і камітэты рэспублікі правялі пэўную работу па перабудове марксісцка-ленінскай адукацыі. Так, уводзілася новая арганізацыйная структура: школы маладых камуністаў, асноў марксізму-ленінізму, навуковага камунізму, тэарэтычныя і метадалагічныя семінары. Гэтая структура дазволіла ў той час больш улічваць агульнаадукацыйны і культурны ўзровень, прафесійную і грамадскую дзейнасць слухачоў.

Значна зменшылася колькасць палітшкол на базе няпоўнай сярэдняй і пачатковай адукацыі. Напрыклад, калі ў 1980/81 навучальным годзе ў Брэсцкай абласной партыйнай арганізацыі іх налічвалася 400 з колькасцю слухачоў каля 9 тысяч, то ў 1981/82 вучэбным годзе адпаведна 148 і 2500, што складала 3,5 % слухачоў сістэмы партыйнай адукацыі. У той жа час 36 % слухачоў займалася ў школах асноў марксізму-ленінізму, больш 50 % — у школах навуковага камунізму [2]. Пры гэтым многія партыйныя арганізацыі клапаціліся не столькі аб колькасці слухачоў, сколькі аб паляпшэнні якасці вучобы, і ў першую чаргу — камуністаў.

Неабходна адзначыць, што і ва ўмовах абмежавання самастойнасці і ініцыятывы, рэжыму чакання ўказанняў, інструкцый, рэкамендацый многія партыйныя арганізацыі, прапагандысты шукалі свае шляхі, метады работы са слухачамі. Творча падыходзілі да арганізацыі партыйнай вучобы на Мінскім трактарным заводзе. Так, на адным з пасяджэнняў быў адобраны вопыт пастаноўкі вучобы ў ліцейным цэху. У цэнтры ўвагі партыйнай арганізацыі пастаянна знаходзіліся пытанні якаснага паляпшэння вучэбнага працэсу, пошук дзейсных форм работы па ператварэнню тэарэтычных і палітычных ведаў слухачоў у кіраўніцтва да практычнага дзеян-

ня. Школы, гурткі і семінары былі арганізаваны з улікам адукацыйнага ўзроўню, зменнасці работы, жадання слухачоў вывучаць тую або іншую праблему. У творчых планах прапагандыстаў знайшлі адлюстраванне пытанні развіцця пазнавальнай актыўнасці, мэтавай вызначаннасці ў рабоце слухачоў, аказанне ім дапамогі ў абгрунтаванні і прыняцці сацыялістычных абавязацельстваў, асабістых творчых планаў.

Узбагачаючы свой ідэйна-тэарэтычны ўзровень, слухачы адначасова сталі выконваць і пэўную грамадскую работу. Так, за тры вучэбныя гады, з 1978 па 1981, 205 слухачоў уключыліся ў індывідуальную выхаваўчую работу, 28 з'яўляліся палітінфарматарамі, 18 — агітатарамі, 23 — настаўнікамі моладзі, 125 — членамі ДНД. Значна ўзрасла і працоўная актыўнасць рабочых: 288 чалавек перавыканалі свае асабістыя планы, 508 заваявалі і падцвердзілі званне «Ударнік камуністычнай працы». Калектыў цэха паспяхова выканаў заданне X пяцігодкі [3].

Пэўны вопыт арганізацыі партыйнай вучобы, укаранення актыўных метадаў вучобы быў набыты ў Віцебскай партыйнай арганізацыі. Так, Першамайскім РК КПБ г. Віцебска быў ухвалены вопыт прапагандыста вытворчага аб'яднання «Маналіт» імя 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі А. М. Каламайнэн па забяспячэнню адзінства і ўзаемасувязі пазнавальнай, выхаваўчай і кантрольнай функцый актыўных метадаў навучання. Для дасягнення гэтага яна арганізоўвала работу слухачоў з работамі класікаў марксізму-ленінізму, дакументамі партыі і ўрада, шырока выкарыстоўвала метады праблемнага навучання, тэхнічныя і наглядныя сродкі. Працуючы індывідуальна са слухачамі, яна аказвала ім практычную дапамогу ў распрацоўцы і рэалізацыі асабістых сацыялістычных абавязацельстваў, далучэнні асобных слухачоў да рацыяналізатарскай дзейнасці, падрыхтоўцы палітінфарматараў, агітатараў, настаўнікаў моладзі. Праблемная пастаноўка пытанняў, аналіз розных вытворчых сітуацый, спрэчкі садзейнічалі развіццю дыялектычнага мыслення слухачоў, уменню звязваць тэорыю з практыкай, весці агітацыйную работу [4]. Асобным відам практычных заданняў лічыў прапагандыст падрыхтоўку рэфератаў. Пры іх напісанні слухачы ўключалі матэрыял, атрыманы на аснове асабістых назіранняў пры аналізе працы калектыва.

Адказна падыходзіла да выбару тэматыкі практычных заданняў прапагандыст З. І. Камарова. Гэту работу яна пачынала да пачатку навучальнага году, узгадняла яе з партыйнай арганізацыяй і адміністрацыяй [5].

Аднак, нягледзячы на праведзеную работу па ўкараненню гэтага метаду, маштабы яго распаўсюджвання і аддача адставалі ад патрабаванняў часу. Важнейшым паказчыкам яго эфектыўнасці з'яўляецца ўнясенне канкрэтных прапаноў па ўдасканальванню вытворчасці і грамадскай работы. Сацыялагічныя даследаванні паказалі, што, напрыклад, за апошнія тры гады разглядаемага перыяду толькі 30 % слухачоў унеслі канкрэтныя меркаванні па ўдасканальванню дзейнасці працоўных калектываў. Заставаўся нізкім і працэнт іх рэалізацыі. Безумоўна, гэта залежыла ў значнай ступені ад іх якасці. Аднак у многіх партыйных арганізацыях не быў наладжаны сістэматычны ўлік і аналіз лепшых прапаноў.

Няўвага да ініцыятывы слухачоў, безпадстаўная затрымка з рэалізацыяй прапаноў рэзка зніжалі цікавасць да заняткаў, падрывалі веру ў магчымасць перамен да лепшага. Гэта з'яўлялася адной з прычын пасіўнасці слухачоў. На працягу навучальнага года большасць рабочых выступала на занятках не часцей як 3 — 4 разы. Пры падрыхтоўцы да заняткаў яны рэдка звярталіся да першакрыніц, часцей абмяжоўваліся вывучэннем матэрыялаў перыядычнага друку, чытаннем вучэбных дапаможнікаў.

У структуры практычных заданняў большасць часу адводзілася эканамічным пытанням. Аднак такі падыход не садзейнічаў у поўнай меры фарміраванню светапогляду слухачоў. Гэта прыводзіла да супярэчнасці паміж неабходнасцю прыблізіць заняткі да канкрэтных праблем працоўнага калектыву і захаваць метадалагічную накіраванасць вучобы. Нярэдка на занятках разглядаліся дробныя непаладкі вытворчасці, а не прынцыповыя пытанні тэорыі і практыкі.

Але ніякія змены ў формах і метадах палітычнай вучобы не дасягнуць мэты, калі не будуць выкарыстоўвацца асабістыя намаганні слухачоў, актыўная самастойная работа па вывучэнню марксісцка-ленінскай тэорыі. Пагэтаму партыйныя арганізацыі разглядалі пытанні павышэння эфектыўнасці палітычнай самаадукацыі як першачарговыя. Станоўчы вопыт кіравання самаадукацыяй быў набыты ў партыйных арганізацыях г. Наваполацка. Так, партыйнае бюро цэха 101 вытворчага аб'яднання «Палімір»

распрацавала мерапрыемствы па кантролю за самастойным вывучэннем рабочымі твораў заснавальнікаў марксізму-ленінізму, партыйных дакументаў. З гэтай нагоды спецыяльная камісія раз у квартал аналізавала стан спраў па самастойнаму вывучэнню першакрыніц, заслухоўвала сумесна з партыйным бюро справаздачы слухачоў і начальнікаў змен і партгрупоргаў аб справах у іх зменах і партыйных групах. Гэта ў значнай ступені садзейнічала таму, што цэх неаднаразова займаў прызавыя месцы ў сацыялістычным спаборніцтве, значна ўзрасла працоўная і грамадска-палітычная актыўнасць слухачоў [6].

Прапагандысты праводзілі са слухачамі індывідуальныя гутаркі і кансультацыі па рабоце з першакрыніцамі, правяралі і рэцэнзіравалі іх канспекты, ставілі перад слухачамі праблемныя пытанні. Дзейснай формай кантролю за ўзроўнем і якасцю палітычнай самаадукацыі слухачоў сталі бягучыя залікі па вузлавых тэмах праграм. Такія залікі атрымалі шырокае распаўсюджванне ў Магілёўскай, Брэсцкай, Гомельскай і іншых абласных партыйных арганізацыях. Напрыклад, у 1982 годзе такую форму вучобы прымянялі 93 % прапагандыстаў школ асноў марксізму-ленінізму, усе прапагандысты школ навуковага камунізму Гомельшчыны [7].

Нягледзячы на асобныя поспехі, сістэма палітычнай вучобы ўсё больш і больш адставала ад практыкі, абрастала фармалізмам. У многіх школах і семінарскіх групах заняткі праходзілі на нізкім ідэйна-тэарэтычным і метадычным узроўнях, насілі вузкаасветніцкі характар. Гэта з'явілася вынікам пралікаў у кіраўніцтве вучобай з боку партыйных арганізацый. Аналіз паказвае, што 2/3 пытанняў, разглядаемых гаркомамі і райкомамі партыі КПБ, закраналі толькі арганізацыйны бок справы. Пры гэтым выкананне прымаемых па гэтых пытаннях пастаноў, як правіла, не кантралявалася. Зместу, ідэйна-тэарэтычнаму ўзроўню заняткаў, эфектыўнасці вучобы адводзілася мала ўвагі. Напрыклад, у дзесяці РК КПБ Магілёўскай вобласці акрамя «дзяжурных» пытанні палітычнай вучобы на працягу 1977 года зусім не разглядаліся. Як паказвае вопыт, такое абмеркаванне мэтазгодна праводзіць рэгулярна, а не толькі перад пачаткам навучальнага года і пасля яго заканчэння. Гэта дазволіць аператыўна ўздзейнічаць на арганізацыю і змест заняткаў, своечасова ўносіць неабходныя змены ў навучальны працэс, павысіць адказнасць слухачоў за свой ідэйны рост. Асобныя партыйныя арганізацыі не заслухоўвалі справаздачы камуністаў аб павышэнні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, не прымалі мер па фактах ухілення слухачоў ад вучобы, зрыву і пераносу заняткаў. Палітычная вучоба часта праводзілася ў адрыве ад актуальных задач выхавання працоўных, практыкі гаспадарання. Сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя АГН пры ЦК КПСС у Віцебскай вобласці паказалі, што толькі 15,3 % апытаных ведалі планавыя заданні сваіх прадпрыемстваў па росту прадукцыйнасці працы, 18 % — па павелічэнню аб'ёму вытворчасці, 14,7 % — па зніжэнню сабекошту прадукцыі [8]. Безумоўна, гэта характэрна і для іншых абласцей.

Недаацэнка некаторымі партыйнымі арганізацыямі палітычнай вучобы, фармальны падыход да яе арганізацыі і зместу ў вывучаемы перыяд прыводзілі да таго, што яна пераставала быць арганізуючым і мабілізуючым фактарам, пераўтваралася ў адбыццё прымусовай павіннасці. І ніякія арганізацыйныя мерапрыемствы не маглі ажывіць вучобу ва ўмовах, калі нельга было праводзіць творчыя дыскусіі, адкрыта абменьвацца думкамі, калі слухачы недаверліва адносіліся да афіцыйных матэрыялаў, разглядаемых на занятках, бо яны супярэчылі фактам жыцця рабочых, працоўных калектываў.

Дэмакратызацыя сацыялістычнага грамадства, перабудова палітычнай і эканамічнай вучобы будуць садзейнічаць пераадольванню гэтых і іншых недахопаў, што, несумненна, станоўча адаб'ецца на фарміраванні марксісцка-ленінскага светапогляду, палітычнай культуры рабочага класу.

[1] О дальнейшем совершенствовании партийной учебы в свете решений XXVI съезда КПСС: Постановление ЦК КПСС, 26 мая 1981 г. // КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1982. Т. 14. С. 385.

[2] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 146, спр. 60, арк. 6.

[3] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 28, воп. 19, спр. 3, арк. 115—116.

[4] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 42, воп. 59, спр. 8, арк. 106—111.

[5] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 42, воп. 63, спр. 7, арк. 139.

[6] Там жа. Ф. 9801, воп. 11, спр. 21, арк. 128—130.

[7] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 146, спр. 60, арк. 38.

[8] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 102, воп. 58, спр. 2, арк. 73.